# ВОДЗЫЎ

навуковага кіраўніка Марзалюка Ігара Аляксандравіча на кандыдацкую дысертацыю Галынскага Рамана Дзмітрыевіча “Эвалюцыя гарадской прасторы Быхава і вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельніцтва ў XIV–XVIII стст.”

**Навуковая вартасць дысертацыі**

Дысертацыйнае даследаванне Галынскага Рамана Дзмітрыевіча з’яўляецца самастойным і завершаным даследаваннем, у якім упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі выкананы комплексны аналіз эвалюцыі гарадской прасторы Быхава разам з вытворча-гаспадарчай дзейнасцю яго насельніцтва ў XIV–XVIII стст. Дысертацыя падрыхтавана на аснове вялікай колькасці археалагічных і пісьмовых крыніц, навуковай літаратуры. Выкананы комплексны аналіз крыніц, частка з іх упершыню ўводзіцца ў навуковы ўжытак. Дысертацыя змяшчае грунтоўны аналіз гістарыяграфіі праблемы, комплексны аналіз крыніц. Р.Д. Галынскі ў межах свайго дысертацыйнага даследавання выканаў вялікую працу па выяўленні і вывучэнні археалагічных калекцый, якія адлюстроўваюць вытворча-гаспадарчую дзейнасць насельніцтва Быхава і эвалюцыю гарадской прасторы ў XIV–XVIII стст.

Дысертацыя грунтуецца на базе наратыўных і актавых крыніц, рэпрэзентатыўных комплексаў артэфактаў, атрыманых у ходзе археалагічных даследаванняў 2012–2016 і 2018 гг., археалагічных калекцый з музейных фондаў, картаграфічных матэрыялаў. Даследаванні па падобнай тэматыцы і змесце, прысвечаныя Старому Быхаву, адсутнічаюць як у айчыннай, так і ў замежнай гістарыяграфіі.

**Характарыстыка навуковай, навукова-педагагічнай і вытворчай дзейнасці саіскальніка**

Саіскальнік зарэкамендаваў сябе як адказны, удумлівы і кампетэнтны даследчык. Галоўнае пытанне, якое закранаецца ў прапанаваным даследаванні, – урбаністычнае асяроддзе горада, яго гандлёвыя, эканамічныя, культурныя і мілітарныя кантакты, сацыяльная тапаграфія. Уся гэта сукупнасць, у сваю чаргу, знаходзіць выразнае адлюстраванне ў комплексах рэчаў, якія з’яўляюцца люстраным адбіткам, маркерам, што вызначае жыццё, побыт і паводзіны чалавека ў паўсядзённым існаванні. У даным выпадку – жыхара Быхава.

Саіскальнікам разгледжаны ўмовы ўзнікнення Быхава, працэсы, што ўплывалі на яго эвалюцыю, фарміраванне жыццёвай прасторы быхаўчан, іх заняткі і комплексы рэчаў, якія выкарыстоўвалі майстры і якімі карысталіся ў сваіх гаспадарках жыхары горада.

На падставе вывучэння эвалюцыі матэрыяльнай культуры горада прааналізавана развіццё гарадской прасторы Быхава разам з вытворча-гаспадарчай дзейнасцю яго насельніцтва з часоў першай згадкі паселішча ў пісьмовых крыніцах да ператварэння ў сталіцу графства. Вызначаны прычыны і ўмовы для развіцця Быхава ў горад-крэпасць і яго роля ў рэгіёне.

Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання прадстаўлены ў 30 навуковых публікацыях. З іх 8 – артыкулы ў навуковых рэцэнзуемых часопісах, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (5,21 аўт. арк.), 19 – артыкулы ў зборніках навуковых канферэнцый (4,7 аўт. арк.), 2 – у матэрыялах канферэнцый (0,07 аўт. арк.). Апублікавана 1 калектыўная манаграфія, у якой адна з глаў напісана ў сааўтарстве (0,17 аўт. арк.). Агульны аб’ём апублікаваных работ складае 10,15 аўт. арк.

Дысертацыйнае даследаванне з’яўляецца самастойнай і завершанай працай аўтара. Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі комплексна даследаваны ўвесь спектр крыніц па эвалюцыі гарадской прасторы Быхава разам з вытворча-гаспадарчай дзейнасцю яго насельніцтва ў XIV–XVIII стст. Распрацавана аўтарская тыпалогія пэўных археалагічных комплексаў, на падставе якой прасочваецца эвалюцыя гарадской прасторы Быхава XIV–XVIII стст. У навуковы ўжытак уведзены шэраг новых крыніц (археалагічныя калекцыі, фотадакументы, інвентары горада Быхава), якія раней ці не вывучаліся ўвогуле, ці не былі прадметам пільнай навуковай увагі пры вывучэнні вытворча-гаспадарчай дзейнасці і паўсядзённага жыцця быхаўчан і матэрыяльнай культуры горада. Зроблены каталог археалагічнага матэрыялу і рэканструкцыя знешняга выгляду комплексаў побытавых рэчаў, архітэктурных аб’ектаў і гарадской забудовы.

**Навуковы кіраўнік**
**старшыня Пастаяннай камісіі**
**па адукацыі, культуры і навуцы**
**Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага**
**сходу Рэспублікі Беларусь,**
**член-карэспандэнт Нацыянальнай**
**акадэміі навук Беларусі,**
**доктар гістарычных навук, прафесар** **І. А. Марзалюк**

17.02.2023

**ВЕРНО**
Начальник отдела по защите
государственных секретов
и кадровой работе
Т. А. Байтинская